УДК 821.161.3.09"19"

**В.І. Палукошка**
(Мінск, Беларусь)

# ЖАНРАВЫЯ ЭКСПЕРЫМЕНТЫ Ў БЕЛАРУСКІМ РУСКАМОЎНЫМ РАМАНЕ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ[4]

*Прааналізавана беларуская рускамоўная раманістыка другой паловы XX стагоддзя. Заўважана, што жанравыя эксперыменты найбольш характэрны для гістарычнага рамана. Тут можна вылучыць такія жанравыя формы, як дума, запіскі і быліна. Схільнасць да жанравых эксперыментаў і пошук новых жанравых форм вылучаюць у дадзеным аспекце творчасць Э. Скобелева.*

Катэгорыя жанру ў літаратуразнаўстве, з аднаго боку, даволі папулярны прадмет даследавання: выйшла безліч манаграфій, навуковых зборнікаў і асобных артыкулаў, прысвечаных жанрам пэўнага роду, гістарычнага перыяду, у творчасці пісьменніка, жанравым асабліваcцям асобнага твора, агульнай тэорыі жанру, – што

[4] Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы БРФФД.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

стала падставай для вылучэння асобнай літаратуразнаўчай галіны – геналогіі (ці жанралогіі).

Аднак пры гэтым жанравыя даследаванні з’яўляюцца актуальным накірункам у сучасным літаратуразнаўстве. Гэтаму, найперш, спрыяе бесперапынны рух літаратурнага працэсу і творчыя пошукі літаратараў. На думку некаторых даследчыкаў, галоўнай функцыяй жанравых сістэм з’яўляецца камунікатыўная, задача якой – аблегчыць працэс камунікацыі паміж аўтарам і чытачом. Жанр у дадзеным выпадку – гэта перш за ўсё ключ да разумення твора.

Жанравая вызначанасць твора заўсёды фарміруе ў чытача пэўны гарызонт чакання, а для аўтара яна выступае мадэллю пісьма. Вельмі часта ўжо самі назвы твораў дапамагаюць суаднесці іх з канкрэтнымі жанравымі тыпамі. Аўтарскае ж вызначэнне жанру праз падзагаловак ці іншую пазнаку апелюе да чытацкага вопыту рэцыпіента, а разам з тым і да літаратурнай традыцыі, і з іх дапамогай стварае канкрэтныя чаканні зместу і формы тэксту. Пры гэтым вельмі часта жанравы падзагаловак уступае ў дыялагічныя адносіны з жанравым канонам і з’яўляецца своеасаблівым маркерам творчага эксперымента.

Сярод беларускіх рускамоўных раманаў другой паловы XX стагоддзя сваёй жанравай шматзначнасцю і нават пэўнай эксперыментальнасцю вылучаюцца найперш творы Эдуарда Скобелева («Мирослав, князь Дреговичский: Дума о минувшем», «Свидетель: Записки капитана Тимкова», раманы-антыўтопіі «Катастрофа» і «Маятник надежды») і раман-быліна Сяргея Зайцава «Побеждая – оглянись».

Чытачам Э. Скобелеў вядомы і як паэт, і як празаік, і як драматург. Ён аўтар шэрагу твораў для дзяцей. Проза пісьменніка характарызуецца не толькі багаццем жанраў і тэм, але і своеасаблівай дыфузіяй жанраў. Вельмі цікавым у гэтым сэнсе з’яўляецца гістарычны раман «Мирослав, князь Дреговичский: Дума о минувшем» (1979 г.) пра падзеі рэлігійнай вайны, якую выклікала хрышчэнне Русі князем Уладзімірам. Паводле формы раман Э. Скобелева ўяўляе сабой літаратурную і тэксталагічную містыфікацыі. У першым выпадку мы маем справу са старажытным рукапісам канца X стагоддзя, праўда, апрацаваным спецыялістам. Гэтая праца назіраецца не толькі па грунтоўных гістарычных, этнаграфічных каментарах, якія становяцца неад’емнай часткай рамана, але і па ўстаўках асобных слоў у тэксце, указанні пропускаў пашкоджаных і таму нечытабельных месцаў. Асаблівасцю рамана з’яўляецца і яго стылізаваная пад стараславянскую мова. Гэта крыху ўскладняе чытанне і ўспрыманне тэксту, тым больш для непадрыхтаванага чытача. Аднак асаблівасць аўтарскай задумы патрабуе менавіта такое формавыяўленне.

Вядомая зараз пераважна як эпічны жанр украінскага фальклору, дума, тым не менш, знайшла сваё ўвасабленне і ў мастацкай творчасці. Даволі папулярнай яна стала ў польскай літаратуры, а адтуль была перанесена К. Рылеевым ў рускую, дзе, праўда, не атрымала вялікага развіцця.

У старапольскай літаратуры тэрмін дума ўжываўся ў шырокім значэнні (песня) і вузкім – песня пра памерлага рыцара. У рускай жа літаратуры дума існавала пераважна ў дзвюх формах – як ліра-эпічны твор гістарычнай тэматыкі (часта асацыіравалася з гістарычнымі гімнамі) і як лірычная медытацыя на філасофскія,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рэлігійныя, грамадзянскія, сацыяльныя тэмы. Гістарычны раман Э. Скобелева «Мирослав, князь Дреговичский: Дума о минувшем» захоўвае жанравыя рысы як народнай, так і літаратурнай думы.

Як ужо згадвалася вышэй, генетычна думы звязаныя з галашэннямі, якія суправаджаліся пералікам вартасцей памерлага, а «нарацыйныя элементы думы мелі дыдактычныя адзнакі» [5, с. 307]. У рамане Э. Скобелева памерлым з'яўляецца не толькі і нават не столькі князь Міраслаў, які загінуў ад атручаных варожых стрэл, колькі вера продкаў, мінулы жыццёвы і грамадскі парадак. Па словах летапісца, менавіта ў тыя гады, пра якія ён распавядае, знікла старажытная Русь.

«Дума о минувшем» мае фармальныя паказчыкі і такога жанру як летапіс, які вылучаецца сярод іншых жанраў старажытнай хрысціянскай літаратуры сваёй сінкрэтычнасцю і ўяўляе сабой гістарычна-літаратурную кампіляцыю. Выкарыстоўваючы ж прыём імітацыі мемуараў, пісьменнік стварае псіхалагічны эфект прысутнасці субяседніка-апаведача. Мы перажываем хрышчэнне Русі разам з чалавекам, якога прымушаюць адступіцца ад сваёй веры, і глядзім на ўсё вачамі не хрысціяніна-верніка, не манаха, а язычніка, у якога ёсць свой погляд на тое, што адбываецца вакол. Аўтар дазваляе нам паглядзець на вядомыя падзеі і гістарычных асоб у іншым ракурсе.

Такім чынам, у чытача з'яўляецца магчымасць (ці ілюзія такой) пранікнуць у гісторыю знутры і паназіраць за працэсам яе «напісання». Такія ж элементы постмадэрнісцкай паэтыкі, як выкарыстанне прыёму містыфікацыі, інтэртэкстуальнасць, пераасэнсаванне элементаў мінулай культуры, сінтэз розных літаратурных жанраў (дума, летапіс, біяграфія, успаміны і інш.)[5] дапамагаюць стварыць эфект «прысутнасці», пераканаць чытача ў рэальнасці падзей. Але, у адрозненне ад постмадэрнісцкіх твораў, для якіх характэрны гульнёва-іранічныя адносіны да гісторыі і адмаўленне пэўных каштоўнасцей, у рамане Э. Скобелева асаблівая ўвага надаецца праблемам этычнага выбару, грамадзянскай актыўнасці, маральнай устойлівасці асобы.

Гэта ж тычыцца і гісторыка-прыгодніцкага рамана «Свидетель: Записки капитана Тимкова» (1987; часопісная публікацыя – 1986), які таксама мае форму стылізаваных успамінаў. Як і ў папярэдне згаданым творы аўтара, жанравая форма гэтага рамана пазначана аўтарам у падзагалоўку. Паводле «Літаратурнай энцыклапедыі тэрмінаў і паняццяў», жанр запісак «звязаны з роздумамі аб перажытым і прадугледжвае выяўленне асабістай ацэнкі аўтара ці апавядальніка да апісанага» [4, с. 276]. Сам жанр аказаўся даволі рухомым, бо не мае строгай кананічнай формы, акрамя аповеду ад першай асобы.

Асоба апаведача і хранатоп твора адсылаюць нас менавіта да расійскага культурнага і гістарычнага кантэксту. Жанр запісак у гісторыі рускай літаратуры

---

[5] Больш падрабязна пра жанравыя асаблівасці рамана «Мирослав, князь Дреговичский» можна прачытаць у артыкуле Палукошка В.І. «Падзагаловак як частка жанрава-стылявога эксперыменту ў рамане Э. Скобелева "Мирослав, князь дреговичский: дума о минувшем"» (Карповские научные чтения : сб. науч. Статей : в 2 ч. Ч. 2 – Минск : ИВЦ Минфина, 2017. – С. 254–258.).



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

быў вядомы яшчэ з канца XVIII стагоддзя (запіскі А.Ц. Болатава, Кацярыны II) і з'яўляўся найперш апісаннем жыцця грамадскага чалавека. У XIX стагоддзі гэта ўжо адлюстраванне духоўнага жыцця асобы. З жанра «прамежкавай» літаратуры (дакументалістыкі) запіскі паступова ўваходзяць у сферу мастацкую праз містыфікаваны вобраз апаведача.

Дзеянне рамана Э. Скобелева адбываецца пераважна ў сталіцы Расійскай імперыі другой паловы XVIII стагоддзя, калі на чале вялікай дзяржавы непрацяглы час знаходзіўся Пётр II. Галоўны герой, ён жа і апавядач, капітан Цімкоў становіцца не толькі сведкам палітычнай змовы супраць імператара, але і актыўным абаронцам дзяржаўных інтарэсаў. Ён выкрывае антыдзяржаўную дзейнасць масонаў, да апошняга моманту, як можа, бароніць імператара, які для капітана быў увасабленнем Айчыны. Аднак, нягледзячы на свае актыўныя дзеянні, герой не здолее перамагчы абставіны і змяніць ход гісторыі.

У дадзеным творы элементы дэтэктыва і палітычнага рамана даволі ўдала ўпісваюцца ў прыгодніцкую фабулу, дзе, да таго ж, прысутнічае і любоўная гісторыя. У палітычнай мастацкай літаратуры, па назіраннях украінскага даследчыка Е. Полудзеня, абавязкова прасочваецца «ідэалагічнае процістаянне дзвюх сістэм» [6, с. 54], а канфлікт «мае яскрава выражаны антаганістычны характар, дзе адбываюцца сутыкненні сацыяльных, ідэалагічных, палітыка-светапоглядных ідэй» [6, с. 53]. У рамане Э. Скобелева «Свидетель» нешматлікае кола патрыётаў (капітан Цімкоў, князь Матвееў) спрабуюць перашкодзіць масонам атрымаць рэальную ўладу і тым самым змяніць сацыяльную палітыку краіны. Аднак гэтыя намаганні аказваюцца марнымі. І нават Пётр II не здольны кардынальна змяніць што-небудзь у сваёй дзяржаве.

Геналагічная прырода рамана «Катастрофа» (1984) даволі неадназначная, аб чым у свой час пісаў яшчэ А. Адамовіч, гаворачы пра «цяжкасці адаптацыі да жанру» [1, с. 8]. Крытык заўважыў у творы рысы не толькі этнаграфічна-палітычнага нарысу, але і сучаснай утопіі і антыўтопіі.

У рамане распавядаецца пра выдуманую краіну-востраў Атэнаіту, якая атрымала незалежнасць ад каланіяльнай дзяржавы. Яе прэзідэнт, спрабуючы пабудаваць новае грамадства, запрасіў прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі і навукі з розных краін (аўстрыйскі пісьменнік Фром, нямецкі мастак Дутэншызер з жонкай Гартэнзіяй, доктар Мэлс – хірург з Канады, аграном з Анголы Мутомба – гэты своеасаблівы інтэрнацыянал часам нагадвае біблейскі горад Вавілон). Аднак з палітыкай Такібае многія атэнаіты не пагадзіліся, распачаўшы партызанскую вайну. Паказаны ўнутраны канфлікт, а таксама сутыкненне эканамічных і палітычных інтарэсаў розных капіталістычных краін і асобных манапалістаў адсылаюць да такіх жанравых разнавіднасцей, як палітычны і ідэалагічны раман. У творы, пабудаваным на чаргаванні ўнутраных маналогаў герояў, выразна прасочваецца проціпастаўленне дзвюх узаемавыключальных ідэалогій – сацыялізму і капіталізму. Названыя вышэй падзеі прывялі да атамнага выбуху на востраве, да якога, як аказалася, загадзя рыхтаваліся, будуючы спецыяльны бункер. У спецыяльны бункер трапляюць, ратуючыся ад радыяцыі і адначасова становячыся



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выпадковымі ўдзельнікамі нейкага загадкавага эксперымента, галоўныя героі рамана – пісьменнік Фром, Луійя і Гартэнзія. Э. Скобелеў даволі падрабязна апісвае не толькі ўнутранае абсталяванне сховішча, а і даследуе працэсы ўздзеяння чалавечых інстынктаў – і перш за ўсё інстынкту самазахавання – на духоўнае і душэўнае аблічча асобы. Аднак пры гэтым галоўным застаецца ўсё ж такі антываенны пафас дадзенага твора.

Трэба адзначыць, што апакаліптычныя матывы для раманнай прозы Э. Скобелева не новыя. З карцінамі сацыяльнага апакаліпсу ён знаёміць сваіх чытачоў і ў рамане-антыўтопіі «Маятник надежды» (1978).

Аўтарская мадыфікацыя гістарычнага рамана-быліны С. Зайцава «Побеждая – оглянись» (1986) тлумачыцца хутчэй не столькі жаданнем «ліквідаваць прабелы» беларускай народнай эпічнай традыцыі (тым больш, што ў беларускім эпасе пераважаюць не вершаваныя, а празаічныя творы. Подзвігі ж некаторых былінных герояў, пэўныя гістарычныя звесткі складаюць змест іншых жанраў: багатырскіх казак, гістарычных і тапанімічных легенд), і нават не спасылкай на асноўныя крыніцы інфармацыі. Падобнае жанравызначэнне з'яўляецца пэўным тлумачэннем і абгрунтаваннем своеасаблівай паэтыкі твора, дзе рэалістычнымі падаюцца не толькі палітычныя інтрыгі і бітвы з іншымі плямёнамі, але і бітвы з пачварамі і магічныя пераўтварэнні. Пісьменнік даволі падрабязна спыняецца як на апісанні бітвы Таця з пачварным Агнявержцам, так і на апісанні знешняга выгляду апошняга: «Чёрно-зелено было туловище Огнянина. Между острыми шипами его застряли клочки водорослей и комья трясинного ила. Из пасти между длинными зубами прорывался розоватый пар. Чёрные когти стучали на ходу друг о друга. И от тяжёлой поступи ощутимо вздрагивала земля, вода рябилась в омутах, качались кочки» [3, с. 182]. Такое блізкае суседства рэальнага з казачным і містычным з'яўляецца характэрным для народнага эпасу. Генеалагічнай рысай быліны, паралельна з гістарычнай рэальнасцю, фалькларысты адзначаюць і «наяўнасць густога пласта фантастыкі, міфалагічных рэмінісцэнцый, слядоў магіі і анімізму» [2, с. 24], што так ці інакш адлюстравана і ў рамане «Побеждая – оглянись».

Такім чынам, праанілізаваўшы творы раманнага жанру беларускіх рускамоўных аўтараў другой паловы ХХ стагоддзя, можна сказаць, што жанравыя эксперыменты з формай найбольш характэрны для гістарычнай раманістыкі, а ў кантэксце творчасці асобнага аўтара – для твораў Э. Скобелева.

**Спіс літаратуры**

1. Адамович, А. Предисловие / А. Адамович // Э. Скобелев Катастрофа : роман. – Минск : Маст. літ, 1984. – С. 3–12.

2. Восточнославянский фольклор: Слов. науч. и нар. терминологии / редкол.: К.П. Кабашников (отв. ред.) и др. – Минск : Навука і тэхніка, 1993. – 478 с.

3. Зайцев, С. Побеждая – оглянись : роман-былина / С. Зайцев. – Минск : Маст. літ., 1986. – 366 с.

4. Литературная энциклопедия терминов и понятий / под ред. А.Н. Николюкина. – М. : НПК «Интелвак», 2001. – 1600 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

5. Літературознавча енциклопедія: у двох томах. – Т. 1 / авт.-уклад. Ю.І. Ковалів. – Київ : ВЦ «Академія», 2007. – 608 с.
6. Полудень, Є.О. Публіцистичне начало в політичному романі 70–80-х років / Є.О. Полудень // Радянське літературознавство. – 1985. – № 10. – С. 51–57.
Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова